6. ЦА КГБ. Фонд спецгрупп. – Д. 98. – Т. 2. – Ч. 2.
7. Органы государственной безопасности СССР в годы Великой Отечественной войны: сб. документов: в 8 т. – Т. 4, кн. 2. Великий перелом (1 июля – 31 декабря 1943 г.). – М. : Русь, 2008. – 810 с.
8. Центральный архив КГБ Республики Беларусь (ЦА КГБ). Фонд спецгрупп. – Д. 98. – Т. 1. – Ч. 1.
9. НАРБ. – Ф. 1407. – Оп. 2. – Д. 27.
10. Государственный архив Минской области (ГАМн). – Ф. 634. – Оп. 1. – Д. 3.
11. ГАМн. – Ф. – 635. – Оп. 2. – Д.33.

**С. Л. Казлова**

## ПАРАЎНАЎЧЫ АНАЛІЗ НАВУКОВАЙ ІНФАРМАТЫЎНАСЦІ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ КРЫНІЦ БЕЛАРУСКІХ ДЗЯРЖАЎНЫХ АРХІВАЎ ПА ТЭМЕ НАЦЫСЦКАЙ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў АКУПАВАНЫХ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БЕЛАРУСІ (1941–1944)

У апублікаваных савецкіх і беларускіх зборніках дакументаў перыяду Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў ёсць некаторыя матэрыялы па тэме аграрнай палітыкі нацысцкіх акупацыйных улад. Сярод апублікаваных крыніц намі былі прааналізаваныя шматтомныя публікацыі Нюрнбергскага працэсу [1], у якіх змешчаны дакументы аб планаванні нямецкай эканамічнай палітыкі на акупаванай савецкай тэрыторыі. Так, у 1-м томе зборніка матэрыялаў «Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками» есць «Дырэктывы па кіраўніцтве эканомікай у зноў акупаваных усходніх абласцях (“Зялёная папка”)». У 2-м томе зборніка матэрыялаў змешчана адна з інструкцый упаўнаважанага спецыяльнага штаба «Ольдэнбург» па харчаванни і сельскай гаспадарцы статс-сакратара Герберта Бакке – «12 запаведзяў паводзін немцаў на Усходзе і іх адносін з рускімі», якая была адной з частак «Папкі акруговага сельскагаспадарчага фюрэра», а таксама дакументы «Карычневай папкі», загады А. Гітлера аб фарміраванні органаў ваеннага і грамадзянскага кіравання на акупаваных усходніх тэрыторыях і іншыя дырэктывы і распараджэнні. У зборніку дакументаў і матэрыялаў «Совершенно секретно! Только для командования! Стратегия фашистской Германии в войне против СССР» [2] змешчаны матэрыялы, якія характарызуюць план «Ост» і перспектывы каланізацыі і германізацыі савецкай тэрыторыі, высялення і ліквідавання цэлых народаў. Гэта так званыя заўвагі і прапановы «усходняга міністэрства» адносна генеральнага плана «Ост», а таксама «Прававыя, эканамічныя і тэрытарыяльныя асновы развіцця на Усходзе» ад 28 мая 1942 года.

Цікавыя звесткі па тэме даследавання змешчаны таксама ў зборніках дакументаў і матэрыялаў «Преступные цели – преступные средства: Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории

СССР (1941–1944 гг.)» і «Преступные цели гитлеровской Германии против Советского Союза» [3], якія тычацца планаў рабавання, праблемы захавання калгасаў, станаўлення структуры эканамічнага ўпраўлення. Гэтыя зборнікі паказваюць розныя аспекты жыцця людзей у акупацыйных зонах, у тым ліку нямецкія карныя экспедыцыі, якія непасрэдна датычыліся вясковага насельніцтва, утрымліваюць матэрыялы аб выкарыстанні эканомікі акупаваных савецкіх абласцей, мясцовай працоўнай сілы у Германіі, усталяванні тут ваеннага і цывільнага акупацыйнага кіравання, аб вывазе прадукцыі ў 1944 годзе і маштабах рабавання.

Аднак неабходна адзначыць, што ў апублікаваных дакументальных зборніках адсутнічае інфармацыя аб непасрэдным ажыццяўленні і рэалізацыі нацысцкіх сельскагаспадарчых мерапрыемстваў у розных акупацыйных беларускіх зонах, няма ніякіх звестак аб прадстаўніках мясцовых нацысцкіх структур, іх распараджэннях і указаннях у галіне земляробства і жывёлагадоўлі, дзейнасці прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Таму аўтар артыкула вымушаны быў звярнуцца да неапублікаваных архіўных дакументаў, якія і складаюць найбольш каштоўную групу крыніц, значная частка якіх упершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак.

Такім чынам, у асноўным падчас працы над тэмай былі выкарыстаныя матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці. У дадзеныя архіўныя акупацыйныя фонды ўвайшлі дакументы на нямецкай, польскай, украінскай, беларускай і рускай мовах.

Найбольшая колькасць дакументаў па тэме даследавання была знойдзена ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым неабходна адзначыць вопіс 1 фонду 370 (матэрыялы генеральнага камісарыята Беларусі) [4]. У асноўным гэта дакументы распарадчага і справаздачна-інфармацыйнага характару: пратаколы нарад органаў акупацыйнай адміністрацыі, загады і распараджэнні міністэрства па акупаваных ўсходніх тэрыторыях, матэрыялы аб правядзенні мясцовымі нацысцкімі органамі ўлады мерапрыемстваў у сферы земляробства і жывёлагадоўлі; статыстычныя звесткі і справаздачы аб пасевах і ўборцы ўраджаю; дакументы аб фарміраванні падатковай сістэмы на вёсцы; прапагандысцкія справаздачы і інструкцыі для прапагандыстаў; дакументы аб падрыхтоўцы мясцовых сельскагаспадарчых кадраў. Напрыклад, у справе 1897 змешчана распараджэнне генеральнага камісара Генеральнага камісарыята «Беларусь» (ГКБ) Курта Готбэрга ад 5 студзеня 1944 г. адносна правядзення ў жыццё на тэрыторыі генеральнага камісарыята «Беларусь» Дэкларацыі аб сялянскай прыватнай уласнасці на зямлю ад 3 чэрвеня 1943 года.

З вопісаў 4, 5 гэтага фонду [5] была прааналізавана інфармацыя распарадчага і справаздаўчага характару газеты «Службовы веснік ГКБ», «Службовы веснік рэйхскамісарыята Остланд», «Веснік рэйхскамісарыята Украіна», некалькі нумароў «Весніка па пытаннях сельскай гаспадаркі» і «Весніка рэйхсміністэрства па занятых усходніх абласцях» (апошнія два

выдаваліся ў Берліне), «Зборнік загадаў рэйхскамісарыята Остланд» (выдаваўся ў Рызе), «Зборнік загадаў рэйхскамісарыята Украіна», «Веснік рэйхсміністэрства сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці», у якіх утрымліваецца інфармацыя распарадчага характару. Гэта розныя пастановы і распараджэнні цэнтральных і мясцовых нацысцкіх органаў улады, якія тычыліся станаўлення падатковай сістэмы, цэнавай палітыкі, арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і жывёлагадоўлі ў дзяржаўных маёнтках і аднаасобных гаспадарках, выкарыстання працы сельскагаспадарчых перапрацоўчых прадпрыемстваў і інш.

У вопісе 6 фонду 370 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь знаходзяцца дакументы распарадчага і справаздачнага характару. Гэта дырэктывы і распараджэнні вышэйшых нацысцкіх улад, пастановы рэйхсміністэрства ў дачыненні да занятых усходніх абласцей, дакладныя аб гаспадарчым становішчы і дзеянняў партызан у розных акругах ГКБ, спісы супрацоўнікаў генеральнага і акруговых камісарыятаў, планы і справаздачы ў галіне прапагандысцкай працы і г.д. Для прыкладу, тут знаходзяцца дырэктыўныя ўказанні начальніка штаба галоўнакамандавання ўзброенных сіл Германіі Кейтеля ад 14 чэрвеня 1941 г. аб арганізацыі гаспадаркі на акупаванай тэрыторыі СССР, а таксама распараджэнне камандуючага сухапутнымі войскамі вермахта ад 13 жніўня 1941 г. аб абавязковай і своечасовай уплаце насельніцтвам акупаваных усходніх тэрыторый падаткаў і грашовых збораў. Цікавасць таксама выклікае справа 48 вопісу 6 фонду 370, якая ўтрымлівае ўнікальную інфармацыю аб працы прапагандысцкай групы ў Баранавіцкай акрузе ГКБ у перыяд ад кастрычніка 1942 да ліпеня 1943 гг. і носіць у асноўным справаздачны характар [6]. Гэта звесткі аб праведзеных прапагандысцкіх мерапрыемствах (гутарках з сялянамі, надрукаванні агітацыйных атыкулаў у газетах, размяшчэнні прапагандысцкіх вітрын у вёсках, вывешванні плакатаў і раздачы лістовак), а таксама аб настроях сялянства і партызанскай абстаноўцы ў Гарадзішчанскім, Ляхавіцкім, Клецкім, Мірскім, Стаўбцоўскім і Нясвіжскім раёнах акругі.

Каштоўныя дадзеныя былі атрыманыя пры разглядзе фонду 1440, вопісу 3 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь [7]. Гэта перапіска паміж прадстаўнікамі нацысцкіх вярхоў, дакументы гаспадарчага штаба «Ост», матэрыялы па арганізацыі і справаздачы Цэнтральнага гандлёвага таварыства «Ост» аб нарыхтоўцы і збыце сельскагаспадарчай прадукцыі, звесткі аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле, стане сельскай гаспадаркі па раёнах, прапагандысцкія матэрыялы, данясенні аб партызанскай дзейнасці, дадзеныя аб стварэнні «абаронных вёсак». Акрамя таго, у фондзе змешчаны цэлы шэраг справаздач акруговых камісараў ГКБ аб гаспадарчай дзейнасці і эвакуацыі. Перш за ўсё трэба сказаць аб унікальных матэрыялах і дакументах справы 971, якія адлюстроўваюць усе асноўныя гаспадарчыя пытанні, паўстаўшыя перад нацысцкай уладай з пачатку і да канца акупацыі, а таксама праблемы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і кадравыя пытанні. У справе 932 змешчаны цікавы дакумент, які характарызуе канфлікт паміж ваеннай і грамадзянскай нацысцкімі эканамічнымі ўладамі на акупаванай

савецкай тэрыторыі. Гэта ліст намесніка рэйхсміністра акупаваных усходніх тэрыторый Альфрэда Мэйера дзяржаўнаму сакратару Кёрнеру ад 25 верасня 1943 г., у якім ён падымае пытанне гаспадарчага кіравання на «занятых усходніх тэрыторыях», разважаючы аб неабходнасці адмены дубліравання эканамічных распараджэнняў ваенна-гаспадарчых і грамадзянскіх эканамічных структур і аб першынстве загадаў грамадзянскай улады.

Змястоўная і цікавая інфармацыя была знойдзена ў фондзе 4п, вопісу 33а Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь [8]: дакладныя, рапарты, справаздачы супрацоўнікаў раённых і абласных ЦК аб першых месяцах вайны, становішчы на акупаванай тэрыторыі Заходняй Беларусі, настроях мясцовага беларускага насельніцтва, даведкі аб партызанскім руху ў 1942–1943 гг. і аб аграрнай палітыцы захопнікаў у дадзены перыяд.

Падобная інфармацыя была прааналізавана з фонду 1450 – (дакументы партыйнага архіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, Беларускага штаба партызанскага руху), вопісаў 2, 3 [9]. Гэта справаздачы, данясенні, разведматэрыялы партызанскіх атрадаў аб палітыка-эканамічным становішчы на акупаванай тэрыторыі Беларусі, нацысцкай прапагандзе, змяненнях у сельскай гаспадарцы, якія праводзілі немцы на захопленай тэрыторыі, аб усталяванай нацыстамі падатковай сістэме ў заходнебеларускай вёсцы.

З фондаў 650 [10], 651 [11], 652 [12], 655 [13] Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь была прааналізавана распарадчая і справаздачная інфармацыя. Гэта перапіска Цэнтральнага гандлёвага таварыства (ЦГТ) «Ост» са сваімі адзяленнямі ў Глыбокім, Вілейцы, Лідзе і інш. беларускіх гарадах аб правілах збірання падаткаў, вырошчвання сельскагаспадарчых культур. У гэтых фондах змешчаны таксама загады, распараджэнні і дакладныя адносна барацьбы з партызанамі, аб настроях грамадзянскага насельніцтва, аб прызначэнні і звальненні прадстаўнікоў цэнтральных і мясцовых структур упраўлення, перапіска з імперскім камісарыятам па справах Усходу і інш.

Каштоўныя і цікавыя дакументы былі знойдзены ў фондзе 393 вопісу 1 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь [14]. Гэта загады і распараджэнні міністэрства па акупаваных усходніх тэрыторыях адносна прапагандысцкай працы сярод беларускага вясковага насельніцтва, справаздачы аб гаспадарчай дзейнасці мясцовых акупацыйных органаў улады: вядзенні аграрнай гаспадаркі, станаўленні сістэмы сельскагаспадарчых падаткаў на месцах, звесткі аб памерах пасяўных плошчаў і атрыманых ураджаях, пра прывоз племянной жывёлы з нацыскай Германіі і недахоп сельскагаспадарчай тэхнікі.

У фондзе 377, вопісу 1 [15] ўтрымліваюцца дакументы галоўнай сядзібы ЦГТ «ОСТ» у Барысаве. Адсюль была прааналізавана інфармацыя распарадчага і справаздачнага характару: цыркуляры, дырэктывы і інструкцыі барысаўскага дырэктара ЦГТ адносна пытанняў уліку, нарыхтоўкі і збыту сельскагаспадарчай прадукцыі, спісы цэн, месячныя справаздачы аб праведзеных рэвізіях і аб партызанскім руху ў рэгіёнах, квітанцыі і накладныя па сдачы аграрнай прадукцыі. Тут змешчаны таксама распараджэнні і інструкцыі генеральнага дырэктара ЦГТ «ОСТ» адносна сельскагаспадарчых пытанняў.

З фонду 398 [16] намі былі даследаваны матэрыялы мінскай акруговай канторы ЦГТ «ОСТ». Тут знаходзяцца цікавыя дакументы пра перапіску мінскай канторы ЦГТ з яго мясцовымі аддзяленнямі адносна розных пытанняў: дастаўка сельскагаспадарчай тэхнікі, парадак страхавання прадпрыемстваў, збыт і спажыванне аграрнай прадукцыі, парадак працы млыноў, накладныя на атрыманне living рознымі арганізацыямі тавараў са складоў ЦГТ, дырэктывы і ўказанні адносна нарыхтоўкі і апрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Акрамя таго, каштоўнымі нам падаліся службовыя інструкцыі ЦГТ для кіраўнікоў акруговых і раённых кантор, асабістыя анкеты працаўнікоў таварыства і інш. Таксама ў фондзе змешчаны дырэктывы ўсходняга міністэрства і кіраўніцтва ГКБ аб рэгуляванні цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю і разлікі з нямецкай арміяй.

Акрамя таго, аўтарам былі выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, а менавіта: фонд 193 (матэрыялы раённага кіраўніка Жабінкаўскага раёна) [17], фонд 194 (матэрыялы раённага кіраўніка Бярозаўскага раёна) [18], фонд 195 (дакументы раённага кіраўніка Брэсцкага раёна) [19], фонд 198 (дакументы раённага кіраўніка Косаўскага раёна) [20], фонд 201 (дакументы Брэсцкага гарадскога ўпраўлення) [21], фонд 2120 (матэрыялы Пінскага акруговага камісарыята) [22], фонд 2141 (дакументы Пінскага філіяла Валынскай зерневай канторы) [23], фонд 2142 (дакументы Пінскага аддзела Цэнтральнага гандлёвага таварыства «Усход» па закупе і збыце ва Украіне) [24], фонд 684 (матэрыялы Баранавіцкага акруговага камісарыяту) [25], фонд 685 (дакументы Новамышскай раённай управы Баранавіцкай акругі) [26], фонд 689 (матэрыялы Новамышскай валасной управы Новамышскага раёна) [27]. Трэба адзначыць, што ў дадзеных фондах знаходзяцца ўнікальныя дакументы, па якіх можна прасачыць, як распараджэнні цэнтральных нацысцкіх улад на ўзроўні рэйхскамсіарыята «Украіна» (рэйхскамісара Э. Коха) і генеральнай акругі «Валынь-Падолія» (генеральнага камісара Х. Шоне), так і непасрэднае выкананне гэтых распараджэнняў мясцовымі акупацыйнымі ўладамі на ўзроўні акруг і раёнаў. Дакументы дадзенага архіва, выкарыстаныя ў працы, можна разбіць на наступныя групы: распарадчыя дакументы; дакументы справаздаўча-інфармацыйнага характару; матэрыялы, якія датычаць кадраў.

Да першай групы крыніц належаць шматлікія загады, распараджэнні, цыркуляры, прадпісанні і іншыя дакументы акупацыйных улад, у прыватнасці прадпісанні рэйхскамісара, генеральнага камісара, акруговых сельскагаспадарчых кіраўнікоў і раёншэфаў аб сельскагаспадарчых рэформах ў заходнебеларускіх вёсках на тэрыторыі Брэсцкай і Пінскай акруг.

У многіх з гэтых дакументаў цікавым нам падаўся загад рэйхскамісара «Украіны» Э. Коха, які змешчаны ў справе 1 фонду 195, адносна станаўлення падатковай сістэмы на тэрыторыі рэйхскамісарыята і генеральнай акругі «Валынь-Падолле» як яго часткі. Паводле яго ўсе савецкія законы, пастановы і інструкцыі па падаткам, якія дзейнічалі да 21 чэрвеня 1941 г., абвяшчаліся дзеючымі. Рабілася гэта дзеля таго, каб пазбегнуць непа-

разуменняў у эканамічнай палітыцы ў першыя месяцы вайны. У справе 36 фонду 194 змешчаны яшчэ адзін цікавы загад Э. Коха ад 16 ліненя 1942 г. аб выкарыстанні зерневых запасаў, якi сведчыць пра жорсткую палітыку нацыстаў ў дачыненні да прадукцыйнага забеспячэння ўкраінцаў і беларусаў. Згодна з ім ураджай пшаніцы і жыта, якія збіраўся на тэрыторыі рэйхскамісарыята «Украіна», павінен быў разглядацца як дзяржаўная нямецкая ўласнасць і меў прыналежнасць выключна для вермахта. Адпаведна ні ў якім разе ён не павінен быў выкарыстоўвацца мясцовым насельніцтвам, для прадукцыйных патрэбаў якога былі прызначаны толькі ячмень і проса. У загадзе таксама прадпісвалася строга сачыць за выкананнем сялянамі прадукцыйных падаткаў на карысць рэйха.

У акупацыйных фондах Брэсцкага дзяржаўнага архіва знаходзіцца таксама шмат дакументаў адносна асноўных накірункаў і тэндэнцый нацысцкай аграрнай палітыкі на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, яе шматгадовых змен згодна з мясцовымі асаблівасцямі. Напрыклад, у справе 4 фонду 195 мы знаходзім дакладныя звесткі пра сабраны ураджай зерневых на тэрыторыі Брэсцкага раёна ўжо ўвосень 1941 г. Каштоўнай для нашага даследавання ўяўляецца таксама справа 427 фонду 2120, дзе змешчана інфармацыя аб развіцці на тэрыторыі Пінскай акругі жывёлагадоўлі. Унікальныя дадзеныя ўтрымлівае дакумент справы 3856 фонду 201. Гэта апісанне падатку абавязковага страхавання на тэрыторыі рэйхскамісарыяту «Украіна» для ворыўнай зямлі, жылых будынкаў, сельскагаспадарчага інвентару і сельскагаспадарчых культур сялянскіх гаспадарак. Прычым наўрад ці такая страхоўка сялянам выплачвалася, а вось уносіць падатак яны павінны былі абавязкова.

Асобная ўвага ў акупацыйных дакументах Брэсцкага архіва надаецца пытанням працы дзяржаўных маёнткаў, і тут мы можам адзначаць фонд 2120. Так, у справе 536 падаецца агульная лічба маёнткаў, якія функцыянавалі на тэрыторыі Пінскай акругі, з іх дакладнымі назвамі. У справе 441 прыводзяцца звесткі аб сельскагаспадарчых культурах, якія вырошчваліся ў гэтых маёнтках: у справе 474 знаходзіцца інфармацыя аб забеспячэнні маёнткаў тэхнікай, гаспадарчым інвентаром, насеннем і дамашняй жывёлай; у справе 434 падаюцца крыніцы забеспячэння працоўнымі кадрамі і дадзеныя аб плаце, якую атрымоўвалі пастаянныя працаўнікі гэтых маёнткаў; у справе 473 дадзеныя пра падзел працаўнікоў маёнткаў на розныя групы ў залежнасці ад выконваемай імі працы і працоўных гадзінах.

Многія дакументы прысвечаныя працы на тэрыторыі генеральнай акругі «Валынь-Падолле» Цэнтральнага гандлёвага таварыства «Ост», галоўная сядзіба якога знаходзілася ў Луцку, а філіялы ў Роўна і Камянцы. У Брэсцкай і Пінскай акругах яго канторы ствараліся на ўзроўні камісарыятаў, на ўзроўні раёнаў узнікалі раённыя станцыі, а ў сёлах – пункты. З дакументаў фондаў 2142 (справа 1), 2120 (справы 441; 398), 195 (справа 111) мы атрымалі інфармацыю пра вельмі нізкія закупачныя цэны таварыства на сельскагаспадарчую прадукцыю мясцовых сялян акруг. Напрыклад, за здадзеныя 100 кг пшаніцы таварыства плаціла толькі 34 карбованцы, а за 100 кг жыта – 25.

Другая група – дакументы справаздаўча-інфармацыйнага характару – рознага кшталту справаздачы генеральнага і акруговых камісараў аб працы ў раёнах у галіне аграрнай палітыкі, дакументы сельскагаспадарчых кіраўнікоў, стараст, аграномаў, бурмістраў аб змяненнях у заходнебеларускіх вёсках, ходзе выканання збору натуральнага падатку і правядзення сельскагаспадарчых прац. Аб той асаблівай увазе, якую надавала акупацыйная ўлада развіццю жывёлагадоўлі ў сувязі з патрэбай у забеспячэнні вермахта і грамадзянскага насельніцтва нацысцкай Германіі якаснай мясной і малочнай прадукцыяй, сведчыць дакумент справы 36 фонду 194, у якім змешчана справаздача старшыны воласці Бяроза, які паведамляе, што валасныя дзяржаўныя маёнткі спецыялізуюцца на развядзенні пародзістай жывёлы. З дакумента справы 501 фонду 2120 мы даведаліся аб планах пасеваў акупацыйных улад па Пінскай акрузе ўвесну 1943 года, згодна з якімі пасяўная кампанія пачалася 10 сакавіка пасадкамі тытуню і скончылася 25 красавіка пасадкай коксу. Пры гэтым большая частка пасяўных плошчаў была аддазнена пад ячмень (каля 20,531 га) і авёс (каля 20, 250 га).

Асобны комплекс архіўных дакументаў звязаны са справаздачамі мясцовых акупацыйных уладаў аб выніках нападаў партызан на нямецкія гаспадарчыя аб'екты, выніках карацельных акцый супраць партызан і захопе сельскагаспадарчай прадукцыі. Непасрэдную цікавасць выклікаў дакумент, змешчаны ў справе 535 фонда 2120, дзе знаходзіцца справаздача сельскагаспадарчага кіраўніка Пінскай акругі, дзе падаецца інфармацыя аб дзяржаўных маёнтках, на якія здзяйснялі напады партызаны, з пералічэннем дакладных датаў (ліпень 1943) і лічбаў канфіскаванай партызанамі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Вельмі вялікая сетка трэцяй групы дакументаў ці матэрыялы кадравага характару. Гэта снісы жыхароў вёсак з зазначэннем прозвішча, імя, імя па бацьку, узросту, нацыянальнасці, веравызнання, месца пражывання, памерах зямлі, памерах падатку. Пры даследаванні гэтых спісаў аўтарам былі атрыманыя дадзеныя аб колькасці жыхароў вёсак, іх узроставым і палавым складзе, памерах зямлі, якая прыходзілася ў сярэднім на сялянскую гаспадарку, колькасці жывёлы, якая мелася ў сялян падчас вайны і аб колькасці падаткаў. Для прыкладу, у справе 66 фонду 194 утрымліваецца інфармацыя аб колькасці сялянскіх двароў Бярозаўскага раёна, прычым яна датуецца маем 1944 года, але гэтыя звесткі дазваляюць зрабіць высновы і аб колькасці гаспадарак на пачатак вайны, і аб колькасці знішчаных падчас вайны сялянскіх двароў.

З архіўных дакументаў акупацыйных фондаў Брэсцкага архіва цікавасць уяўляе для нас дакумент справы 4 фонду 195. Гэта звесткі аб вясенняй сяўбе 1942 г. у Брэсцкім раёне аб памерах ворыўнай зямлі ў валасцях раёна, засеяных сельскагаспадарчых культурах і іх колькасці. З яго вынікае, што больш ўсяго ў гэты час было ўдзелена ўвагі пасевам жыта (2245 га), бульбы (2021 га), аўса (1994 га), грэчкі (661 га), ячменю (621 га). Пшаніцы было пасеяна толькі каля 36 га. Аб стане сельскай гаспадаркі генеральнай акругі «Валынь-Падолле» ў 1943 г. сведчыць цікавы дакумент справы 461 фонду

2120. Гэта дадзеныя аб колькасці кінутай сялянамі зямлі па Мікашэвіцкай воласці Лунінецкага раёна Пінскай акругі ў сувязі з іх зыходам у лясы ці адпраўкай у Германію. Так, з агульнай колькасці карыснай для сельскай гаспадаркі зямельнай плошчы ў 1 612 га працягвалі апрацоўвацца толькі 603 га зямлі, іншыя тэрыторыі былі ў запусценні.

Цікавая інфармацыя была сабраная аўтарам падчас працы з дакументамі Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, а менавіта фондам 1 – матэрыялы Гродзенскага крайскамісарыята (каля 612 спраў) [28]; фондам 117 –дакументы Мастоўскага амтскамісарыята (каля 25 спраў) [29]; фондам 116 – матэрыялы Скідзельскага амтскамісарыята (каля 16 спраў) [30].

Неабходна адзначыць, што ўвогуле нацысцкіх дакументаў па гаспадарча-эканамічнай дзейнасці на тэрыторыі акругі «Беласток», у тым ліку і заходнебеларускай яго частцы, захавалася мала: амаль усе яны былі знішчаныя пры нямецкім адступленні у 1944 г. Таму інфармацыі для гісторыкаў недастаткова. У акупацыйных фондах Гродзенскага архіва адсутнічаюць многія дакументы цэнтральных гаспадарчых улад акругі, а таксама цалкам адсутнічаюць матэрыялы адносна Ваўкавыскага крайскамісарыята.

У асноўным гістарычныя матэрыялы тут прадстаўлены распараджэннямі аб адміністратыўным падзеле, пратаколамі сходаў кіраўнікоў сельскагаспадарчых аддзелаў амтскамісарыятаў, указаннямі аб каланізацыі Гродзенскага крайскамісарыята, заявамі сялян аб змяншэнні сельскагаспадарчага падатку, матэрыяламі аб жывёлагадоўлі, дакументамі кадравага характару, інфармацыяй аб умовах гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй, распараджэннямі аб устанаўленні цэн, справаздачамі адносна правядзення пасяўных, карткамі па ўліку здачы сельскагаспадарчых падаткаў вясковымі жыхарамі, матэрыяламі пра перапіс гаспадарчай жывёлы па раёнах, а таксама спісамі беззямельных жыхароў.

Адной з нешматлікіх справаў архіва, дзе змешчаны матэрыялы цэнтральных гаспадарчых улад акругі, з'яўляецца дакумент справы 280 фонду 1, у якім пералічаны па прозвішчах усе прызначаныя амтскамісары Гродзенскага крайскамісарыята. У Верцялішках амтскамісарам быў прызначаны Шанко, у Скідзелі – Плэтц, Парэччы – Кірм, Камёнцы – Бэстэк, Новым Двары – Клімашэўскі, у Капцёўцы – Корх. Як бачна, на працу сюды накіроўваліся і немцы, і палякі. На жаль, больш падрабязная інфармацыя пра іх біяграфіі ў дакуменце адсутнічае. Да гэтага шэрага можна далучыць таксама справу 536 фонду 1, з якой мы даведаліся пра тое, што 23 ліненя 1942 г. адбылася нарада амтскамісараў, падчас якой абмяркоўваўся ураджай сельскагаспадарчых культур, якія былі пасеяны на тэрыторыі крайскамісарыята ў тым годзе, а менавіта бульбы, ячменю, пшаніцы, аўса, грэчкі і тытуню.

Пацвярджэннем факта рабавання салдатамі вермахта гаспадарчай маёмасці заходнебеларускіх сялян у 1941 г. з'яўляецца справа 64а фонду 1, дзе пададзены звесткі пра канфіскацыю ў сялян вёсак Мастаўляны, Пясчанка, Пусевічы, Карашава і інш. амтскамісарыята Скідзель свінняў і коней, а таксама зерня на агульную суму 3 382 рэйхсмаркі. Падобны дакумент мы

знаходзім таксама ў справе 64 фонду 1, дзе пералічаны страты, якія нанеслі нямецкія войскі сялянам Скідзельскага амтскамісарыята з вёсак Верцялішкі, Капліца, Казловічы, Баяры, Грынёўка і інш., але дакумент датуецца ўжо вераснем 1943 г. У ім ёсць патрабаванне сельскагаспадарчага камісара амтскамісарыята пра тое, каб у нямецкія вайсковыя улады вярнулі сялянскую маёмасць, але ўжо ў грашовым эквіваленце. Сялянам Камёнкі павінны былі вярнуць 6 409 рэйхсмарак, Скідэля – 10 993, Верцялішкаў – 10 541, Новага Двару – 13 737, Адамавічаў – 13 235 і г.д. Такім чынам, гэты дакумент сведчыць аб пастаянным канфлікце, які адбываўся паміж нямецкімі вайсковымі і грамадзянскімі ўладамі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Справа 536 фонду 1 архіва сведчыць пра тое, што нацысцкія акупацыйныя ўлады надавалі праблеме зерневага забеспячэння асаблівую ўвагу. У справе змешчана інфармацыя аб колькасці наяўных на тэрыторыі Гродзенскага камісарыята млыноў. Апошнія былі двух відаў: водныя і машынныя. Адзначалася, што ўсяго на тэрыторыі крайскамісарыята такіх млыноў 203, былі пададзеныя назвы вёсак з дакладнай іх колькасцю. Напрыклад, у вёсцы Ласосна камісарыята падчас вайны было 20 водных млыноў, а ў вёсцы Лунна – 12 машынных.

Значны па колькасці пласт нацысцкіх дакументаў архіва інфармуе пра пастаяны рост падаткаў і грашовых збораў, якія збіралі немцы з насельніцтва заходнебеларускіх тэрыторый акругі «Беласток». Пра вялікія памеры натуральнага падатку, напрыклад, сведчаць дакументы са справы 534 фонду 1 Гродзенскага архіва. У іх ёсць лічбы аб колькасці бульбы за 1941 год, якую трэба было здаць вясковаму насельніцтву Гродзенскага крайскамісарыята: амтскамісарыят Каменка павінен быў здаць 300 тон бульбы, Скідзель – 250 тон, Сапоцкін і Верцялішкі – па 150 тон кожны і г.д. Параўноўваючы гэтыя лічбы колькасці бульбы з лічбамі на наступны, 1942 год, якія змешчаны ў дакуменце справы 536 фонду 1, мы можам сцвярджаць, што яны значна выраслі ў памерах, у некаторых амтскамісарыятах нават у некалькі разоў. Так, з амтскамісарыята Сапоцкін у наступным годзе трэба было здаць ужо 500 тон бульбы. Прычым у дакуменце паведамлялася аб тым, што ўвесь сабраны на тэрыторыі амтскамісарыятаў кантынгент пойдзе на забеспячэнне нямецкай арміі. Нацысты спрабавалі рознымі шляхамі прымусіць сялян акругі да цалкавітага выканання грашовых падаткаў і натуральных кантынгентаў. Напрыклад, дакумент 15 фонду 1 сведчыць аб тым, што тым сялянам, якія здавалі ўсе неабходныя падаткі і добра вялі сваю гаспадарку, акупацыйныя ўлады змяншалі памеры зямельнага падатку з 8 рэйхсмарак ад 1 га ворыўнай зямлі ў месяц да 1 рм.

Асобную цікавасць вызываюць дакументы Гродзенскага архіва, якія сведчаць аб падрыхтоўцы нацыстаў на тэрыторыі акругі да рэалізацыі планаў анямечвання і каланізацыі. Гэта дакументы фонду 1. Напрыклад, у справе 536 змешчана распараджэнне гродзенскага крайскамісара аб аграрнай палітыцы на падуладнай яму акупаванай тэрыторыі, у якой ён гаварыў пра тое, што акруга «Беласток» павінна быць каланізавана немцамі. А ў справе

531 ёсць яшчэ адно распараджэнне крайскамісара, у якім ён таксама паведамляе пра неадкладную каланізацыю і неабходнасць аддаць пад будучыя нямецкія маёнткі найлепшыя па якасці сялянскія землі. Справа 536 фонду 1 захоўвае таксама звесткі пра колькасць працуючых на тэрыторыі Гродзенскага крайскамісарыята дзяржаўных маёнткаў. Згодна з імі на 1943 год тут існавала 11 655 маёнткаў памерам ад 5 да 10 га, 4 144 – ад 11 да 25 га, 362 – ад 26 да 50 га, 51 маёнтак – ад 51 да 125 га, а таксама 38 маёнткаў памерам больш за 125 га. Гэтыя дадзеныя таксама сведчаць пра тое, што тэрыторыю акругі нацысты актыўна рыхтавалі да каланізацыі. Дакументы справы 536 фонду 1 і справы 8 фонду 116 паведамляюць даследчыкам аб высяленні мясцовых сялян Гродзенскага крайскамсіарыята на іншыя тэрыторыі з мэтай падрыхтоўкі вызваленых земляў да засялення нямецкімі каланістамі. 28 студзеня 1943 года гродзенскі крайскамісар паведамляў Э. Коху аб цяжкасцях, з якімі сутыкнуліся нацысцкія ўлады пры правядзенні перасяленчых акцый: кепская арганізацыя, недахоп транспартных сродкаў, неабходнасць продажу пакінутага сялянамі гаспадарчага інвентару і г.д.

Такім чынам, мы бачым, што дакументы нацысцкіх фондаў беларускіх дзяржаўных архіваў маюць розную інфарматыўнасць. У дакументах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь мы знаходзім у асноўным распараджэнні вышэйшых нацысцкіх чыноўнікаў усходняга міністэрства, рэйхскамісарыята, генеральнай акругі, а таксама справаздачы мясцовых акупацыйных чыноўнікаў. У дзяржаўных архівах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей змешчаны амаль выключна дакументы справаздачнага характару мясцовых нацысцкіх структур; архіўныя дакументы закранаюць абсалютна розныя пытанні: ад распараджэнняў па правядзенні мерапрыемстваў ў сферы земляробства і жывёлагадоўлі да справаздач аб ўраджайнасці; ад указанняў адносна падатковай палітыкі і дзейнасці дзяржаўных маёнткаў да справаздач аб забеспячэнні сельскагаспадарчай прадукцыяй вермахта і рэйха; ад дакументаў аб прызначэнні і звальненні прадстаўнікоў цэнтральных і мясцовых структур упраўлення да дакладных адносна барацьбы з партызанамі і г.д.

## ЛІТАРАТУРА


1. Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками : сб. материалов : в 7 т. / под общ. ред. Р. А. Руденко. – М. : Госюриздат, 1957–1961. – Т. 7.
2. Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками : сб. материалов : в 3 т. / под общ. ред. Р. А. Руденко. – М. : Госюриздат, 1965–1966. – Т. 3.
3. Нюрнбергский процесс : сб. материалов : в 8 т. / отв. А. М. Рекунков. – М. : Юрид. лит., 1987. – Т. 8.
4. Совершенно секретно! Только для командования! Стратегия фашистской Германии в войне против СССР : док. и материалы / сост. В. И. Дашичев ; под ред. Н. Г. Павленко. – М. : Наука, 1967. – 752 с.

5. Преступные цели – преступные средства : док. об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941–1944) / сост. Г. В. Заставенко. – 2-е изд. – М. : Политиздат, 1968. –383 с.
6. Преступные цели – преступные средства: док. об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941–1944 гг.) / сост. Г. В. Заставенко. – 3 изд., расшир. – М. : Экономика, 1985. – 325 с.
7. Преступные цели гитлеровской Германии в войне против СССР : док. и материалы / Ин-т воен. истории ; под ред. П. А. Жилина. – М. : Воениздат, 1987. – 301 с.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 370. – Воп. 1.
9. НАРБ. – Фонд 370. Воп. 4, 5.
10. НАРБ. – Фонд 370. Воп. 6.
11. НАРБ. – Фонд 1440. Воп. 3.
12. НАРБ. – Фонд 4 п. Воп. 33а.
13. НАРБ. – Фонд 1450. Воп. 2, 3.
14. НАРБ. – Фонд 650. Воп. 1. Спр. 1.
15. НАРБ. – Фонд 651. Воп. 1.
16. НАРБ. – Фонд 652. Воп. 1.
17. НАРБ. – Фонд 655. Воп. 1.
18. НАРБ. – Фонд 393. Воп. 1.
19. НАРБ. – Фонд 377. Воп. 1.
20. НАРБ. – Фонд 398. Воп. 1, 2.
21. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 193. Воп. 1.
22. ДАБВ. – Фонд 194. Воп. 1.
23. ДАБВ. – Фонд 195. Воп. 1.
24. ДАБВ. – Фонд 198. Воп. 1.
25. ДАБВ. – Фонд 201. Воп. 1.
26. ДАБВ. – Фонд 2120. Воп. 1.
27. ДАБВ. – Фонд 2141. Воп. 1.
28. ДАБВ. – Фонд 2142. Воп. 1.
29. ДАБВ. – Фонд 684. Воп. 1.
30. ДАБВ. – Фонд 685. Воп. 1.
31. ДАБВ. – Фонд 689. Воп. 1.
32. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Фонд 1. Воп. 1.
33. ДАГВ. – Фонд 117.
34. ДАГВ. – Фонд 116.